М. Смотрицкий, перейдя в унию, отошел от идеи мирного сосуществования религий, культур и народов. Он писал, что не будет большим грехом наставить православных на путь истинный силой: «Язвы нашего народа такого свойства, что, если не употребишь сил железа для очищения их, он никогда не придет в чувство и, разжигаемый адским огнем, будет со дня на день изнемогать более и более и, наконец, совершенно погибнет».

М. Смотрицкий покинул большое, очень неравноценное в идейно-политическом значении литературное наследство. Свою общественную деятельность, как было отмечено, он начал в рядах православной оппозиции, как борец против унии, а закончил в лагере униатов. Благодаря всестороннему образованию и блестящим литературно-публицистическим способностям он завоевал у современников славу выдающегося полемиста, пользовался среди них большим авторитетом и популярностью.

***С.А. Гур'еў***
БДУ (Мінск)

## СТАНАЎЛЕННЕ САВЕЦКАГА КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА НА БЕЛАРУСІ

З самага пачатку савецкае крымінальнае права з'яўлялася адным з важнейшых сродкаў умацавання савецкай дзяржаўнасці і ўяўляла сабой найбольш эфектыўную магчымасць правядзення класавай палітыкі дзяржавы дыктатуры пралетарыяту і ўсталявання палітыка-ідыялагічнага аднадумства.

Пасля ўтварэння Беларускай ССР на яе тэрыторыі працягвала дзейнічаць крымінальнае права РСФСР, якое грунтавалася не на законе, а на рэвалюцыйнай самасвядомасці дзеячаў розных рэвалюцыйных камітэтаў, трыбуналаў, Усерасійскай Надзвычайнай Камісіі і яе мясцовых органаў, судоў і іншых карных устаноў. 5 ліпеня 1918 г. V Усерасійскі з'езд Саветаў прыняў рэзалюцыю аб увядзенні масавага тэрору супраць буржуазіі. Пра ўвядзенне «чырвонага тэрору» сведчыць і пастанова СНК РСФСР ад 5 верасня 1918 г.

Асноўныя змяненні ў крымінальным заканадаўстве гэтага перыяду адбываліся ў сферы ўзаемаадносін чалавека і дзяржавы. Асаблівае развіццё атрымала сістэма пакаранняў, прычым яна становіцца ўсё больш жорсткай. У першых дэкрэтах савецкай улады асаблівая ўвага надавалася крымінальнай адказнасці за найбольш небяспечныя для новага грамадскага ладу дзеянні: контррэвалюцыйную дзейнасць, сабатаж, хабарніцтва, спекуляцыю, дэзертырства і інш.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

Паступова сфарміравалася сукупнасць несістэматызаваных нормаў Агульнай і Асаблівай частак крымінальнага права РСФСР. У Беларускай ССР паступова пачалі дзсйнічаць і ўласныя заканадаўчыя акты. Акрамя таго, суддзі кіраваліся рэвалюцыйнай правасвядомасцю. Роля апошняй была значнай і суддзі самі вызначалі крымінальнасць дзеяння, від і памер пакарання.

12 снежня 1919 г. Народны Камісарыят Юстыцыі РСФСР выдаў інструкцыю народным судам пад назвай «Кіруючыя пачаткі па крымінальнаму праву РСФСР», якая з'явілася першым кадыфікаваным дакументам у сферы крымінальнага права і была заклікана адыгрываць ролю Агульнай часткі савецкага крымінальнага права. У гэтым акце ўпершыню ў гісторыі савецкага заканадаўства давалася вызначэнне права як сістэмы грамадскіх адносін, якая адпавядае інтэрэсам кіруючага класу і ахоўваецца яго арганізаванай сілай. У той час лічылася, што кіруючы клас будзе праводзіць у жыццё сваю палітыку дамініравання і ўздзеяння на жыццё ўсяго грамадства як адзінага цэлага праз дзяржаву і права. Як вызначаў Ленін, сістэма прававых нормаў магла асноўвацца толькі на прынцыпах «рэвалюцыйнай, сацыялістычнай» законнасці. У Кіруючых пачатках устанаўлівалася, што «пакаранне не ёсць помста за віну». Адзінай мэтай пакарання абвяшчалася абарона і ахова ўмоў супольнага савецкага жыцця ад пасягальніцтваў. Адмаўленне ад паняцця віны ў крымінальным праве прывяло да таго, што з сярэдзіны 20-х да пачатку 30-х гадоў тэрмін «віна» быў увогуле падвергнуты астракізму. Тым не менш, гэты акт стаў сапраўдным помнікам савецкаму праву і акрэсліў пачатак пераходу да сацыялагічнай прававой школы ў галіне крымінальнага права.

У 1921–1922 гг. заканадаўчыя органы БССР запазычвалі розныя законы РСФСР, уносячы толькі нязначныя папраўкі ў іх з улікам мясцовых умоў. 24 мая 1922 г. быў прыняты Крымінальны Кодэкс РСФСР. Судовыя органы БССР сталі ім карыстацца без афіцыйных указанняў. 26 ліпеня 1923 г. ён афіцыйна быў уведзены ў дзеянне на тэрыторыі БССР. Толькі з 1924 г. гэты кодэкс стаў афіцыйна называцца «Крымінальны кодэкс Беларускай ССР» і яго дзеянне было пашырана на ўсе злачынствы, якія не былі разгледжаны да гэтага часу ў судовым парадку. Гэта значыць, што кодэкс меў зваротную сілу. Мэтай крымінальнага закона аб'яўлялася абарона працоўных ад злачынстваў і грамадска небяспечных элементаў. Наогул, першы крымінальны кодэкс быў тыповым савецкім законам таго часу.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by